Источник: "Наша слова" - 2014-07-16

# УЛАДЗІМІРУ АНІЧЭНКУ - 90



**Уладзімір Васільевіч АНІЧЭНКА**, беларускі мовазнавец нарадзіўся 20 ліпеня 1924 г. ў в. Янаўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ў партызанскім атрадзе ў Чэхаславакіі. У 1952 г. скончыў БДУ. Доктар філалагічных навук (1970). Прафесар (1971). З 1955 г. працаваў у Інстытуце мовазнаўства АН Беларусі, з 1970 г. - у Гомельскім дзяржаўным універсітэце, загадчык кафедры беларускай мовы. Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Бела русь (1976), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 1988 г. за комплекс прац 1966-88 гг. "Скарыніяна".

Найбольш значныя працы прысвяціў гісторыі беларускай мовы, беларуска-ўкраінскім старажытным моўным сувязям, параўнальнай граматыцы ўсходнеславянскіх моў і беларускай лексікаграфіі. Аўтар манаграфіі "Беларуска-ўкраінскія пісьмова-моўныя сувязі" (1969), "Слоўніка мовы Скарыны" (т. 1-2, 1977-84), вучэбных дапаможнікаў для філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў "Марфалогія ўсходнеславянскіх моў. Назоўнік. Дзеяслоў. Прыслоўе" (1973), "Гістарычная лексікалогія ўсходнеславянскіх моў" (1978), "Гістарычная фанетыка ўсходнеславянскіх моў" (1982), "Мовы ўсходніх славян" (1989), суаўтар калектыўных прац "Гістарычная лексікалогія беларускай мовы" (1970), "Матэрыялы для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны", якія апублікаваны ў штогодніку "Беларуская мова" (вып. 3-9, 1975-1981), "Народная лексіка Гомельшчыны ў фальклоры і мастацкай літаратуры" (1983), "Беларуска-іншаславянскі сінкрэтызм мовы выданняў Францыска Скарыны" (1988). Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле падрыхтаваны да друку "Слоўнік мовы Янкі Купалы" У. В. Анічэнка выдаў са сваімі прадмовамі і навуковымі каментарыямі рукапісы помніка старой беларускай пісьменнасці "Александрыя" (1962) і зборніка 19 ст. "Беларускі казачны эпас" (1976). Ён адзін са складальнікаў хрэстаматый "Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы" (ч. 1-2, 1961 - 62) і "Пісьменнік і мова" (1962). Галоўны рэдактар рэспубліканскага міжведамаснага зборніка "Беларуская мова" з пачатку выдання (1973).

*Вікіпедыя.*